Вараб’ёва В.В., студ. гр. 513 ФТБКі СМ
БГУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Піскун Н.Д.,
канд. мастацтвазнаўства, дацэнт

# ШЧАСЦЕ СТВАРАЦЬ СУЛАДДЗЕ: ПЕДАГАГІЧНАЯ СПАДЧЫНА МАСТАКА ЛАДЫ СЯРГЕЕЎНЫ ШЧАСНАЙ (1965–2007)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Жыццевыя перакрыжаванні, дзе адбываецца сустрэча з іншым шляхам і лёсам, асабліва поўным велічы і глыбіні, часам нябачна, але непазбежна змяняюць наш шлях і свет. Сярод такіх перакрыжаванняў у кожным жыцці вылучаецца час навучэнства. Якім яно мусіць быць і што здольна абудзіць чалавека да самаўдасканалення – адны з галоўных пытанняў у чалавечай культуры. Наш супярэчлівы імклівы час вымагае шукаць мудрыя ды складаныя адказы, здольныя прадухіліць самаразбурэнне душы і грамадства. Роля настаўніка змяняе свае прызначэнне – ад транслявання ведаў да абуджэння ствараць, з дапамогай ведаў ды мыслення мудра пераўтвараць сябе і свет, колькасць праблем якога не памяншаецца.

Мастак і выкладчык Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў Лада Сяргееўна Шчасная – Настаўнік, які пятнаццаць гадоў здзяйсняў гэту філасофію ў жыцці. Па-мастакоўску непаўторна, ўзрушана і шчыра…

Жыццёвы шлях Лады Сяргееўны Шчаснай пачаўся 5 верасня 1965 года ў Мінску ў цудоўнай сям’і, сапраўднай творчай дынастыі. Яе дзед, патомны полацкі шляхціц Іван Шчасны, быў вядомым у краіне выкладчыкам беларускай мовы, аўтарам многіх школьных падручнікаў. Яго жонка, педагог Марыя Андрэеўна Ладзіс, дачка вядомага кузняца і ювеліра Андрэя Ладзіса, была ідэйным кіраўніком усіх творчых пераўтварэнняў у сям’і. Бацькі Лады Сергееўны – знакамітая мастачка Нінэль Шчасная ды архітэктар Сяргей Неумывакін. Атмасфера вялікай творчай сям’і дазволіла з маленства раскрыцца мастацкаму таленту Лады. У дзяцінстве яна навучалася ў легендарнай студыі Васіля Сумарава. У 1984 годзе Лада

Сяргееўна скончыла Мінскую мастацкую вучэльню, а ў 1989 годзе – аддзяленне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытуту (зараз Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў). Пасля заканчэння акадэмічнага навучання час прысвячаўся плённай працы: роспісу інтэр'ераў у Інстытуце праблем культуры, Тэатры юнага гледача, дзіцячым аддзяленні анкалагічнага шпіталю ў Бараўлянах. За гэтыя мастацкія работы ў 1990 годзе Лада Сяргееўна была ўзнагароджана прэміяй ЛКСМБ. У гэты ж час яна працавала над вывучэннем беларускай традыцыйнай культуры, стварэннем кніжных ілюстрацый, інтэр'ераў, жывапісных палотнаў.

З 1993 года Лада Сяргееўна пачала выкладаць кампазіцыю і колеразнаўства на кафедры народных рамёстваў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, акрэсліўшы новы падыход у выкладанні творчых дысцыплін. Менавіта ён стаў адным з самых значных дасягненняў педагагічнага мастацтва Лады Сергееўны.

Падыход фарміраваўся ў адметнай культурнай прасторы. Мэты, якія ставіла перад сабой і здольна была ажыццявіць традыцыйная сістэма навучання, ужо не маглі адпавядаць часу і ўяўляліся стрымліваючымі для творчага спасцігнення рэчаіснасці.Патрэбу пераўтварэнняў адчувала ўся педагагічная сістэма, але методыка выкладання мастацкіх дысцыплін патрабавала пераасэнсавання ў першую чаргу, бо мела справу непасрэдна з творчым працэсам. З іншага боку, былі добра бачны наступствы заходняй уседазволенасці ў мастацтве – у першую чаргу, яго дэгуманізацыя і страта трывалага акадэмічнага падмурку. Кожны шлях мае права на існаванне, але каб захаваць усе каштоўнае, што было здабыта мастацкай школай мінулага, трэба было знайсці хібы старой сістэмы і пераўтварыць іх у новыя магчымасці.

Галоўная праблема ілюстрацыйна-вытлумачальнай сістэмы навучання, дзе развіцце разглядаецца як прырост ведаў і навыкаў, пэўных стэрэатыпаў і норм успрыяцця, – у тым, што яна амаль не прадугледжвае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзаемадзеяння з непаўторным досведам і ўнутраным светам навучэнца. Бесперапыннае ігнараванне гэтага свету прыводзіць да страты здольнасці самастойнага ўсведамлення з'яў жыцця, да немагчымасці мыслення па-над шаблоннымі ўзорамі, а значыць, і творчасці. Галоўная ж станоўчая якасць – сапраўднае авалоданне шэрагам ведаў і навыкаў, без якіх творца можа застацца інтэлектуальна ці тэхнічна непаўнавартасным.

Каб спалучыць умацаванне акадэмічнага падмурку з поўным раскрыццем маладога мастака, Лада Сяргееўна стварыла сістэму, у якой панавала двухфокуснае спасцігненне свету – з аднаго боку, кожнае вучэбнае заданне прадугледжвала глыбокае вывучэнне той ці іншай эпохі, графічнай ці жывапіснай тэхнікі, мастацкага стылю, а таксама адзінства характару эпохі, яе дамінантнага стылю (ці стыляў) і асобы мастака. Апроч асэнсавання скіраванасці кожнага працэсу, звязанага з мастацтвам, вынікам такой даследчай ці тэхнічнай працы заўсёды павінны быў стаць аўтарскі твор, у якім знаходзіла месца асабістае стаўленне да матэрыялу. Так ствараліся цыклы твораў: "Нацюрморт, калі я – Ван Гог, Кустодыеў, Далі і я сам", " Мой Бах, мой Шапэн, мой улюблёны музыка", " Маё адчуванне Булгакава, Шэкспіра, улюблёнай кнігі". Студэнты працавалі з навуковымі крыніцамі, арыгіналамі мастацкіх твораў, але тэхнічныя моманты былі цалкам падпарадкаваны творчай задачы. Гэта стварала адметную атмасферу, у якой студэнт засвойваў правы і адказнасць творцы.

Яшчэ адно пытанне, да разваг над якім далучаўся кожны студэнт Лады Сягрееўны – чаму існуе мастацтва?

Тысячагоддзі мастацтву было наканавана магічным чынам структураваць свет, прамаўляць нябесную гармонію. Але мастацтва нашага часу не вельмі часта спалучаецца з гармоніяй ды прыгажосцю.Галоўнай становіцца іншая катэгорыя – шчырасць аўтара.

Спажыванне мастацтва, шчырасць якога дэструктыўная, не можа прывесці да росквіту грамадства, але няшчырая прыгажосць ужо не выклікае веры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Ці можа шчырае быць гарманічным? – пытала Лада Сергееўна. – Мусіць, так, але ў тым выпадку, калі спачатку мастак стварыў тую сапраўдную гармонію ў сабе, настроіў складаны інструмент сваёй душы…”

Станаўленне і раскрыцце ўнутранага свету мастака, гарманічнага і ўстойлівага да дэструктыўных уздзеянняў, здольнага да спачування, асэнсавання і ўзбагачэння рэчаіснасці – вось мэта творчага падыходу Лады Сяргееўны Шчаснай.

Менавіта гэтая справа – падтрымка ў спасцігненні сябе, самаўдасканаленні, адчувальная ў працэсе працы над кожным вобразам, справа, што патрабуе вялікай любові, чуласці і сапраўднай душэўнай шчодрасці, зрабіла магчымай плённасць новага падыходу.

Лада Сяргееўна мела рэдкі чароўны талент непрыкметна ўносіць у жыццё суладдзе. Так, каб чалавек заўсёды меў выбар, якая шчырасць яму бліжэй - павярхоўная, бязлітасная ці крынічная шчырасць душэўнага росквіту. Атрымоўваючы ў падарунак рэдкі дар даверу і душэўнага цяпла Майстра, вучань не мог не змяняцца, бо стары светапогляд пераставаў задавальняць узрастаючыя патрэбы душы.

12 лютага 2007 года пасля цяжкой і працяглай хваробы Лада Сяргееўна Шчасная пайшла з жыцця, пакінуўшы пасля сябе вялікі суладны свет, што ўзбагаціў і ўзбагачае ўсіх, хто ў яго ўваходзіць.

Большая частка карцін мастачкі знаходзіцца ў прыватных калекцыях Беларусі, Германіі, ЗША, Ізраэля, Іспаніі, Нідэрландаў, Польшчы і Расіі.

Педагагічная спадчына Лады Сяргееўны працягвае ўзбагачаць навучальны працэс Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, а таксама мастацкіх вучэльняў і каледжаў краіны, дзе працуе мноства яе ўзрушаных удзячных вучняў. Вялікая справа стварэння суладнасці працягваецца, назаўседы захаваўшы ў сабе велічны, шчыры і светлы вобраз Настаўніка – Лады Сяргееўны Шчаснай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ